# СУСТРЭЧЫ НА БРЭСЦКАЙ ЗЯМЛІ

Цяжка пісаць пра чалавека, з якім многа звязана, здзейснена, але які, на жаль, заўчасна пайшоў з жыцця. Наколькі радасней і прыемней гаварыць аб ім на чарговым юбілеі, з нагоды атрымання ўзнагароды, ці нават на звычайным навуковым мерапрыемстве. Я маю на ўвазе доктара гістарычных навук, прафесара Анатоля Васільевіча Шаркова.

Наша першая сустрэча з Анатолем Васільевічам адбылася на пачатку 1990-х гадоў. Як вядома, гэта быў даволі складаны час. Распалася вялікая дзяржава, якая доўгі час была нашай радзімай. З яе распадам знік і звыклы вобраз жыцця. Не ўсе былі гатовыя да новых умоў існавання. Асабліва цяжкім было ўспрыняцце новай парадыгмы, у яснове якой ляжала «я», а не «мы». У складанай сітуацыі апынуліся навукоўцы, выкладчыкі ВНУ, асабліва прадстаўнікі грамадазнаўчага накірунку. Зніклі такія дысцыпліны, як «Гісторыя КПСС», «Навуковы камунізм», «Палітычная эканомія». А гэта азначала і скарачэнне штатаў. Пагоршылася і матэрыяльнае становішча навукоўцаў і выкладчыкаў. Прыстасавацца да змен змаглі самыя моцныя, гатовыя кінуць выклік новым рэаліям. Менавіта такім чалавекам і быў Анатолій Васільевіч Шаркоў. У адзін з майскіх веснавых дзён у мяне ў кватэры прагучаў тэлефонны званок. Дарэчы, кватэра была дзяржаўнай, гэта значыць бясплатнай. Мала таго, мне, як кандыдату навук, выдзяляўся особны пакой. Такім чынам, атрымалася, хаця і не вялікіх памераў, чатырохпакаёвая кватэра. Гэта адзін са штрыхоў савецкай рэчаіснаці. Сучаснай моладзі зрумець такую сітуацыю не магчыма. Званіў мой калега, які сказаў, што да мяне хоча завітаць выкладчык Мінскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Уладзімір Платонавіч Паўлаў. Уладзіміра Платонавіча я ведаў. Пасля заканчэння гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта я быў накіраваны на працу на кафедру гісторыі КПСС Брэсцкага дзяржаўнага інстытута імя А. С. Пушкіна. У 1985–1988 гг. я з’яўляўся аспірантам кафедры гісторыі КПСС Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, дзе пачалася мая навуковая дзейнасць па вывучэнні гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, якая працягваецца і зараз. У 1988 г. пад кіраўніцтвам выбітнага навукоўца, выдатнага педагога, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Мікалаевіча Мацко я абараніў кандыдацкую дысертацыю. У час майго навучання Уладзімір Платонавіч Паўлаў быў ужо кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам. Кандыдацкую дысертацыю ён таксама рыхтаваў пад кіраўніцтвам А. М. Мацко. «Знаёмся, – сказаў Уладзімір Платонавіч, – Анатолій Васільевіч Шаркоў, яшчэ адзін вучань паважанага Аляксандра Мікалаевіча, прадстаўнік ваенных гісторыкаў Беларусі». Адзначу, што Аляксандр Мікалаеіч Мацко быў і навуковым кансультантам доктарскай дысертацыі А. В. Шаркова. Як высветлілася з далейшай размовы, Уладзімір Платонавіч і Анатолій Васільевіч займаліся пошукам месцаў пахавання нямецкіх салдат на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Брэст стаў адным з этапаў пошукавай працы. У гісторыкаў быў прыкладны

план пошукаў. Я не з'яўляўся спецыяістам у гэтай справе, але ў некаторай ступені ведаў горад. Таму выступіў у ролі своеасаблівага гіда. Як паказалі далейшыя падзеі, кароткая сустрэча стала ппачаткам шчырых сяброўскіх адносінаў, якія працягваліся да заўчаснай смерці Анатоля Васільевіча.

Пераломнымі ў нашых адносінах сталі 2000-я гады, калі я пачаў працу над доктарскай дысертацыяй. Сустракаючыся на разнастайных навуковых мерапрыемствах, пазнаёміліся бліжэй. Менавіта ў гэты перыяд адбылася і наша новая сустрэча на берасцейскай зямлі. Сябры Анатоля Васільевіча ведалі яго, як нястомнага працаўніка, падарожніка, і не толькі па Беларусі, але і за яе межамі. У час аднаго з такіх падарожжаў на тэрыторыі Брэсцкай вобласці па дарозе з Пружан у яго сапсавалася машына. Я запрасіў яго і яго сяброў пераначаваць ў мяне ў кватэры. Аднак яны выбралі начоўку на дачы. Дома я атрымаў наганяй ад сваёй жонкі Валянціны за тое, што не паклапаціўся як патрэбна пра начлег гасцей і не ўгаварыў іх пераначаваць у кватэры. Мы ўсе заначавалі на дачы. Жонка была ўражана. «Доктар навук, прафесар, палкоўнік, а такі просты чалавек», – зрабіла яна заключэнне. Дарэчы, дадзенае заключэнне не падвяргалася сумненню на працягу ўсіх нашых далейшых сустрэч з А. В. Шарковым. І яшчэ на адну асаблівасць характару Анатолія Васільвіча звярнула ўвагу Валянціна – з якой цеплынёй і любоўю гаварыў ён пра сваю жонку Таццяну. Якая яна ў яго клапатлівая і таленавітая. Паснедаўшы, мы паехалі рамантаваць машыну. Быў выхадны дзень, і многія аўтасэрвісы не працавалі. Тым не менш мы выканалі задачу. А потым А. В. Шаркоў і яго спадарожнікі паехалі на Мінск. У час гэтай сустрэчы Анатоль Васільевіч упершыню назваў маю жонку «прафесарша». На маю заўвагу пра тое, што я яшчэ не прафесар, ён адказаў: «Будзеш і доктарам навук, і прафесарам. Я ў гэтым не сумняваюся». Яго словы аказаліся прарочымі. Я абараніў доктарскую дысертацыю, атрымаў вучонае званне прафесара. Але на працягу ўсяго перыяду да атрымання азначаных рэгалій Анатолій Васільевіч пры любой сустрэчы ў Мінску абавязкова дадаваў: «Як пажывае прафесарша? Абавязкова перадавай ёй прывітанне».

Асаблівасцю характару Анатолія Васільевіча, як мне падавалася, было тое, што не існавала такіх спраў, якія былі б не пад сілу гэтаму чалавеку. Наступная наша сустрэча стала пацвярджэннем дадзенай высновы і датычыла падрыхтоўкі чарговай кнігі па новай тэматыцы. На гэты раз пошукавая праца была звязана са святымі крыніцамі на тэрыторыі Беларусі. Сааўтарам будучай кнігі з'яўлялася Алёна Іванаўна Харашэвіч, вядомы журналіст, знаўца Германіі і нямецкай мовы. Я, але ўжо разам з жонкай, выступіў у вядомай мне ролі – гіда па тэрыторыі Брэсцкага, Пружанскага, Камянецкага раёнаў Брэсцкай вобласці. Як гэта нярэдка бывае, наша падарожжа зацягнулася. Мы наведалі больш крыніц, чым планавалі, таму ў Брэст вярнуліся позна. Заначавалі ў нас, але ўжо ў кватэры. Мы з Валянцінай у чарговы раз упэўніліся, які добразычлівы чалавек Анатоль Васільевіч. Ад яго зыходзіла добрая, пазітыўная энергія. У поўнай меры дадзеныя словы можна аднесці і да яго спадарожніцы – Алены Іванаўны.

Калі напачатку восені 2019 г. прагучаў тэлефонны званок, я ўжо не быў здзіўлены і задаў толькі адно пытанне аб тым, што шукаем на гэты раз. Аказалася, што аб'ектам пошукаў з'яўляюцца месцы пахаванняў удзельнікаў савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Пакуль Анатоль Васільевіч і Алена Іванаўна даехалі, я, у адпаведнасці з планам, склаў прыкладны маршрут пошукаў на тэрыторыі Брэста. Адны могілкі выклікалі маё здзіўленне. Пражыўшы дзесяткі гадоў у Брэсце, я не ведаў пра існаванне ў горадзе даволі вялікага пахавання ўдзельнікаў паўстання С. Булах-Булаховіча. Дарэчы, нягледзячы на прыкладнае месца яго знаходжання, мы доўгі час не маглі знайсці самі могілкі.

У Анатоля Васільевіча была яшчэ адна мэта – сабраць успаміны ўдзельнікаў абароны Брэсцкай крэпасці ў верасні 1939 г. Аднак здзейсніць гэтага не ўдалося, бо за некалькі месяцаў да нашай размовы памёр апошні абаронца.

Я ўдзячны лёсу, што ён даў мне магчымасць быць знаёмым з такім цудоўным чалавекам. У мяне ёсць шмат кніг А. В. Шаркова з асабістым подпісам аўтара. Гэта памяць пра выдатнага навукоўца, добрага сябра, чалавека з вялікай літары. На жаль, такія людзі рана сыходзяць з жыцця, не рэалізаваўшы многіх планаў і задумак.

*Уладзімір Васільевіч Здановіч,*
*доктар гістарычных навук, прафесар*